# МАБІЛЬНЫ ДОКТАР У АДДАЛЕНАЙ ВЁСЦЫ

## КОМПЛЕКС ЗАМЕСТ ФАПА

Пытанне аптымізацыі сельскай медыцыны паўстала на парадак дня не сёння і не ўчора. З памяншэннем колькасці насельніцтва пэўныя ўстановы аховы здароўя ўсё ж даводзіцца закрываць. З улікам гэтых абставін і быў у свой час распрацаваны перасоўны медыцынскі комплекс, які ўяўляе сабой міні-паліклініку на колах. Брэстчына стала адным з першых рэгіёнаў, які атрымаў такую машыну, аснашчаную ўсім неабходным абсталяваннем.

Перасоўны медыцынскі комплекс з'яўляецца амбулаторна-паліклінічным, ён прадугледжаны для правядзення прафілактычных медыцынскіх аглядаў, дыспансерызацыі насельніцтва, а таксама планавай медыцынскай дапамогі. Медработнікі могуць тут праводзіць розныя медыцынскія ўмяшанні, дыягностыку, лабараторныя даследаванні, а яшчэ робяць прышчэпкі, ну і, вядома, праводзяць тлумачальную і асветніцкую работу.

Некаторыя населеныя пункты размешчаны даволі далёка ад амбулаторый, і шэраг людзей, асабліва пажылых, слабых, адзінокіх, не могуць своечасова дабрацца да доктара, каб хоць раз на год прайсці кваліфікаваны медыцынскі агляд. А тут спецыялісты прыязджаюць па месцы жыхарства.

Як паведаміла **спецыяліст аддзела грамадскага здароўя Брэсцкага абласнога ЦГЭі ГЗ Таццяна ГАПОНІК**, у канцы 2021 года аблвыканкам выдзеліў дадатковыя бюджэтныя сродкі для закупкі трох сучасных медыцынскіх перасоўных комплексаў. Яны паступілі ў Баранавіцкі, Пінскі і Брэсцкі раёны для паляпшэння якасці медыцынскіх паслуг і, галоўнае, іх даступнасці жыхарам



Ідзе прыём на ўчастку Меднаўскай амбулаторыі ў вёсцы Рагозна.

нават самых аддаленых вёсак. На такой машыне цяпер медыцынская брыгада перыядычна накіроўваецца ў глыбінку.

## ГРАФІК — ПАД ПАТРЭБЫ

**Намеснік галоўнага ўрача Брэсцкай гарадской бальніцы № 2** (раней гэта была раённая бальніца Брэсцкага раёна. — **Аўт.**) **Яўген НАВАСАДСКІ** расказаў, што крыху больш як за год работы перасоўнага медыцынскага комплексу і спецыялісты, і мясцовая ўлада ўпэўніліся ў эфектыўнасці новай формы работы.

— Напрыклад, у зону абслугоўвання Чарнаўчыцкай участковай бальніцы ўваходзіць 19 населеных пунктаў. У гэтыя вёскі па чарзе комплекс выязджае па два разы на месяц. Урач агульнай практыкі не толькі наведвае пацыентаў свайго ўчастка, але і мае магчымасць зрабіць ЭКГ, узяць аналізы, правесці іншыя патрэбныя маніпуляцыі, — гаворыць Яўген Уладзіміравіч. — За мінулы год машына ажыццявіла 124 выезды, было прынята і агледжана каля паўтары тысячы чалавек. Важна, што 282 пацыенты пасля агляду накіраваны на далейшае даабследаванне. У выніку былі прыняты рашэнні аб шпіталізацыі, амбулаторным лячэнні альбо выдадзены рэкамендацыі пацыенту. Падкрэсліваю гэты факт, бо названыя людзі маглі б самі не звярнуць увагу на сімптомы, якія заўважыў урач, альбо палічыць іх неістотнымі. Гаворка ідзе пра жыхароў не самых блізкіх вёсак, якія не заўсёды самастойна выбіраюцца на прыём.

Выезды перасоўнага медыцынскага комплексу заўсёды рыхтуюцца загадзя. Аб прыездзе медыкаў людзі ведаюць за тыдзень, іх звычайна інфармуюць сельвыканкам і староста вёскі. «Але цяпер, дарэчы, улічваючы прапановы людзей, стараемся апавяшчаць яшчэ і праз сацыяльныя сеткі, тэлеграм-каналы, — дадае суразмоўнік. — Значыць, такая форма абслугоўвання набірае папулярнасць. Аб апошнім сведчыць і зваротная сувязь. На прамыя лініі паступалі прапановы ад жыхароў тых вёсак, дзе медыцынская машына яшчэ не была, — прыехаць да іх».

**Галоўны ўрач гарадской бальніцы № 2 Яўген КАПЫЛЕЦ**, які курыруе ахову здароўя Брэсцкага раёна, сказаў, што адначасова з работай комплексу вядзецца пошук спосабаў аптымальнага яго выкарыстання:

— Раней планавалі складаць графік і строга яго прытрымлівацца. Цяпер вырашылі, што галоўная задача — ахапіць як мага больш вёсак, даехаць да самай аддаленай. Таму графік можа быць скарэкціраваны пад надзённыя патрэбы і запыты медыкаў сельскіх устаноў аховы здароўя.

## У КАЗІШЧА — ШЭСЦЬ РАЗОЎ ЗА ГОД

Год таму перасоўныя медыцынскія комплексы атрымалі Кобрынская, Івацэвіцкая і Столінская цэнтральныя раённыя бальніцы. Як расказала карэспандэнту газеты **намеснік галоўнага ўрача Кобрынскай райбальніцы Аксана СІВЯНКОВА**, летась у сярэдзіне чэрвеня перасоўны медыцынскі комплекс прыступіў да работы. Якраз у гэты час быў скасаваны Казішчанскі фельчарска-акушэрскі пункт. Дык у вёску Казішча, дзе пражывае 103 чалавекі, медыцынская машына заязджала шэсць разоў на год.

— Унутры нашай машыны, як і іншых такіх жа, размяшчаецца некалькі міні-кабінетаў, дзе можа прымаць пацыентаў урач агульнай практыкі альбо вузкі спецыяліст, ёсць магчымасць зрабіць электракардыяграму, правесці забор крыві на аналізы, а таксама жанчынам прайсці агляд акушэра-гінеколага. Людзі ўжо ведаюць і актыўна ідуць на прыём да мабільнага доктара, — расказвае Аксана Алегаўна. — Кожны месяц я складаю графік выездаў. Звычайна на прыём прыязджаюць урач агульнай практыкі і памочнік урача. Урач найчасцей выязджае з той амбулаторыі, у зону адказнасці якой уваходзіць населены пункт. Акушэр-гінеколаг выязджае па асобным графіку. Такім чынам, за год мы ахапілі аглядам і прафілактыкай 1917 жыхароў у 103 населеных пунктах.

«Лічу, што медыцынская дапамога стала больш даступнай для жыхароў малых і аддаленых вёсак. Некаторыя, асабліва пажылыя, хворыя людзі, гадамі не выбіраліся ў медыцынскую ўстанову», — падсумавала Аксана Сівянкова.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ** пракаментаваў:

— У вобласці сёння функцыяніруе 345 ФАПаў. У шасці раёнах працуюць перасоўныя медыцынскія комплексы. У гэтым годзе праведзена працэдура закупкі яшчэ чатырох комплексаў. Яны будуць накіраваны ў Іванаўскі, Бярозаўскі, Пружанскі, Ганцавіцкі раёны. Усё пералічанае мае на мэце паляпшэнне якасці і даступнасці медыцынскай дапамогі насельніцтву маланаселеных і аддаленых вёсак, на правядзенне прафілактычных медыцынскіх аглядаў і дыспансерызацыю работнікаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў без адрыву ад вытворчасці з выкарыстаннем дыягнастычных перасоўных комплексаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Японіі плануюць эвакуацыю звыш 200 тысяч чалавек з-за пагрозы апоўзняў



Улады японскай прэфектуры Сідзуока паведамілі аб пагрозе апоўзняў з-за моцных дажджоў, якія пайшлі пасля праходжання тайфуну «Мавар». Больш чым 200 тысячам жыхароў было разаслана прадпісанне эвакуіравацца ў бяспечнае месца, паведаміла газета «Известия». Як пішa выданне, пагроза апоўзняў тычыцца перш за ўсё горада Хамамацу, бо з-за залеваў глеба аказалася моцна падмытая вадой. Згодна з прагнозамі, у найбліжэйшыя дні таксама чакаюцца моцныя дажджы, з-за чаго сітуацыя стане яшчэ больш небяспечнай. Паводле даных японскага метэаралагічнага агенцтва, у гэтыя выхадныя на паўднёвым захадзе Японіі ў горадзе Акінава можа прайсці тайфун. На наступным тыдні прагназуецца яго прасоўванне на паўночны ўсход уздоўж узбярэжжа вострава Хансю.

### Нью-Ёрк узначаліў сусветны рэйтынг гарадоў з самым брудным паветрам

Нью-Ёрк заняў першае месца ў сусветным рэйтынгу гарадоў з самым брудным паветрам на фоне моцных лясных пажараў у Канадзе. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на даныя сайта IQAir, які займаецца маніторынгам якасці паветра ў найбуйнейшых гарадах свету. Лясныя пажары ў Канадзе прывялі да таго, што Нью-Ёрк і некаторыя іншыя амерыканскія гарады аказаліся ахутанымі жоўтай смугой. Паводле звестак Дэпартамента аховы здароўя і псіхічнай гігіены Нью-Ёрка, у горадзе фіксуецца найгоршая з 1960-х гадоў якасць паветра. Мэр горада Эрык Адамс папярэдзіў, што абстаноўка будзе пагаршацца. Паведамлялася аб павелічэнні колькасці зваротаў у бальніцы пацыентаў з астмай, сардэчнымі прыступамі і інсультамі, а таксама з раздражненнем вачэй, скурным свербам і сыпам. Улады заклікалі грамадзян хадзіць па вуліцах у масках.

### У Егіпце закрылі ўсе пляжы ў раёне, дзе акула напала на расіяніна



Пасля смяротнага інцыдэнту з акулай Міністэрства навакольнага асяроддзя Егіпта ўвяло двухдзённую забарону на купанне ў моры, уключаючы падводнае плаванне і ўсе іншыя водныя віды спорту, у раёне паміж Эль-Гунай на поўначы Хургады і Сома-Бі на поўдні. Пра гэта паведаміла CNN. The Guardian піша, што мясцовыя ўлады перакрылі 74-кіламетровы ўчастак берагавой лініі. Аб нападзенні тыгровай акулы на чалавека на пляжы егіпецкай Хургады стала вядома 8 чэрвеня. Генконсул РФ у Хургадзе Віктар Варапаеў удакладніў, што загінуў расіянін 1999 года нараджэння. Па словах дыпламата, загінулы не быў турыстам, а на пастаяннай аснове пражываў у Егіпце. Трагедыя здарылася ў раёне гарадскога пляжа Dream Beach. Відавочцы паведамлялі, што хлопец падчас нападу акулы закрыў сабой дзяўчыну, яна паспела выплысць. За апошнія гады ў егіпецкім Чырвоным моры адбылося некалькі трагічных выпадкаў з акуламі. Паводле даных Міністэрства навакольнага асяроддзя Егіпта, летась дзве жанчыны (аўстрыйка і румынка) загінулі ў выніку нападу акул у моры на поўдні ад Хургады. «У 2020 годзе ўкраінскі хлопчык пазбавіўся рукі, а егіпецкі гід страціў нагу ў выніку нападзення акулы. У 2018-м акула забіла чэшскага турыста каля пляжа на Чырвоным моры», — паведаміла газета Al-Ahram Online.

# ЧЫГУНКА Ў ПАСАЖЫРАЎ «РУЛІЦЬ»

**По папярэдніх даных, у студзені–маі 2023 года Беларуская чыгунка перавезла ва ўсіх відах зносін больш за 24 мільёны пасажыраў, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**



Унутры краіны найбольш папулярнымі маршрутамі ў пасажыраў былі Мінск — Брэст, Мінск — Гомель і Мінск — Віцебск.

У міжнародных зносінах найбольшым попытам карысталіся цягнікі, якія курсіравалі паміж Мінскам і Масквой, Мінскам і Санкт-Пецярбургам.

Усяго з пачатку года ў міжнародных зносінах перавезена больш за аднаго мільёна пасажыраў, што амаль на 22 працэнты больш, чым за аналагічны леташні перыяд.

Цяпер паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй арганізаваны рэгулярныя пасажырскія зносіны ў напрамку Масквы, Санкт-Пецярбурга, Адлера, Калінінграда, Мурманска, Архангельска, Анапы і Самары (з 14 чэрвеня). Штотыдзень паміж дзвюма дзяржавамі курсіруюць каля 150 цягнікоў.

У маі 2023 года паслугамі Беларускай чыгункі скарысталіся каля шасці мільёнаў пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**